8. Vaitkevičienė, D. Ugnies metaforos. Lietuvių ir latvių mitologijos studija / D. Vaitkevičienė. – Vilnius, 2001.
9. Vaitkevičius, V. Senosios Lietuvos šventvietės. Žemaitija / V. Vaitkevičius. – Vilnius, 1998.
10. Замовы. – Мінск, 1992.
11. Ляўкоў, Э.А. Маўклівыя сведкі мінуўшчыны / Э.А. Ляўкоў. – Мінск, 1992. – С. 131 – 135.
12. Зайкоўскі, Э.М. Месца Вялеса ў дахрысціянскім светапоглядзе насельніцтва Беларусі / Э.М. Зайкоўскі. – Мінск, 1998.
13. Zaikovskiy, E. Šventviečių tyrimai Neries (Vilijos) baseine / E. Zaikovskiy // Lietuvos archeologija. – 2005. – T. 27.
14. Кашкурэвіч, Т. Касмаграфія і тапаграфія ў крыўскіх легендах пра камяні-краўцы ды пра паходжанне рэк Вялля (Нярыс) і Бярэзіна / Т. Кашкурэвіч // Druvis. – 2005. – № 1. – С. 37 – 45.
15. Vaitkevičius, V. Alkai. Baltų šventviečių studija / V. Vaitkevičius. – Vilnius, 2003.
16. [Топографическая карта 1865 – 1866 гг. Вильнюсской и Ковенской губерний. Номер листа XIII – 6].
17. [Карта] Военно-топографическое управление. Масштаб 1 верста в дюйме [Первая половина XX в., номер листа LXVIII – 15].
18. Санько, С. Крыўя / С. Санько // Druvis. – 2005. – № 1.
19. Акты, издаваемые Виленского комиссiею для разбора древнихъ актовъ. – Вильна, 1891. – Т. 18.
20. Krikščioniškosios ikonografijos žodynas. Sudarė D. Ramonienė. – Vilnius, 1997.
21. Jablonskis, K. Lietuviški žodžiai senosios Lietuvos raštinių kalboje / K. Jablonskis. – Kaunas, 1941. – T. I.
22. Иванов, В.В. Исследования в области славянских древностей / В.В. Иванов, В.Н. Топоров. – М., 1974.
23. Лозка, А. Беларускі народны каляндар / А. Лозка. – Мінск, 2002.
24. Дучыц, Л. Археалагічныя помнікі ў назвах, вераваннях і паданнях беларусаў / Л. Дучыц. – Мінск, 1993.
25. Дучыц, Л. Этнаграфія і міфалогія курганоў Беларусі / Л. Дучыц // Гіст.-археалаг. зб. – Мінск, 2006. – № 21.
26. Vaitkevičius, V. Examining the Layout Tendencies of East Lithuanian Barrows / V. Vaitkevičius // Papers from the Second Theoretical Seminar of the Baltic Archaeologists (BASE) held at the University of Vilnius, Lithuania, Oct. 21 – 22, 2005. Interarchaeologia-2. – Vilnius – Helsinki – Riga – Tartu, 2007.

## ДА АРЭАЛЬНАЙ ХАРАКТАРЫСТЫКІ ЗАМОЎНАЙ ТРАДЫЦЫІ БЕЛАРУСАЎ ПАДЗВІННЯ

***канд. філал. навук Т.В. ВАЛОДЗІНА***
***(Інстытут мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі, Мінск)***

*«Загаворы хай па беламу свету ходзюць»*
(з каментарыя знахаркі з Лепельскага р-на)

*Прадстаўленая першасная характарыстыка замоўнай традыцыі Віцебшчыны як самой па сабе, так і ў межах агульнабеларускай карціны, а таксама спроба вылучэння тых мікраарэалаў, якія маглі б быць аб'яднаныя па тых ці іншых крытэрыях. Асноўная ўвага ўдзяляецца вылучэнню пэўнай спецыфікі лакальнай традыцыі, якая праяўляецца ў большым ці меншым развіцці пэўных сюжэтаў, матываў і асаблівасцяў структуры тэксту. Такім чынам абмалёўваюцца своеасаблівыя ізаглосы, якія ахопліваюць тэрыторыю Падзвіння і не абавязкова супадаюць з адміністрацыйнымі межамі.*

Замовы – адзін з тых жанраў народнай творчасці, якія выяўляюць высокую ступень інтэрнацыянальнасці як у межах сэнсавай характарыстыкі, так і структуры. Менавіта сярод замоў асабліва выяўна выступаюць тыя фармальныя і сэнсавыя элементы, якія залічваюцца да універсалій, бо абапіраюцца на архаічную сістэму ўяўленняў, псіхафізіялагічную агульнасць чалавечай прыроды, а таксама на падобныя прынцыпы тэкстаскладання. Разам з тым кожная тэрыторыя характарызуецца сваім і даволі ўстойлівым наборам функцыянальных тыпаў, сюжэтаў і персанажаў. Адрознымі выступаюць і асаблівасці структурнай арганізацыі (наяўнасць/адсутнасць зачынаў, закрэпак, зваротаў і г.д.). Сваю ролю ў падобнай неаднароднасці адыгралі многія фактары, сярод якіх – канфесійная прыналежнасць, фактар іншаэтнічных уплываў, ступень распаўсюджанасці кніжнай замоўнай традыцыі і інш.

Крыніцамі даследавання сталі ўсе магчымыя друкаваныя звесткі, а гэта том «Замовы» [1], куды ўвайшлі і запісы Е. Раманава, А. Шлюбскага, «Полацкі этнаграфічны зборнік» [2]. Для дадзенай працы былі франтальна прапрацаваныя архівы Беларусі, дзе патэнцыйна такія замовы маглі б змяшчацца. Гэта Фальклорны архіў Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта (кіраўнік У. Васілевіч), Архіў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАНБ, Архіва навукова-даследчай лабараторыі беларускага фальклору БДУ (кіраўнік Т. Марозава), Архіў Студэнцкага этнаграфічнага таварыства (кіраўнік А. Глушко),

Фальклорны архіў кафедры беларускай літаратуры Віцебскага дзяржаўнага універсітэта (хаця і скрайне недастаткова). Значную частку займаюць уласныя запісы (з 11 раёнаў Віцебшчыны).

Безумоўна, усе далейшыя назіранні могуць мець толькі папярэдні характар, найперш па прычыне недастатковай сабранасці матэрыялу. Наогул, першая выснова даследавання – замовы Віцебшчыны пакуль сабраныя і апісаныя недастаткова. Наогул адкрытым застаецца пытанне, наколькі сабраныя ў дадзеным рэгіёне замовы адлюстроўваюць асаблівасці традыцыі, ці толькі інтарэсы самога збіральніка. Можна нават казаць, што колькасна матэрыял паказвае ў большай ступені на ўзровень даследаванасці той ці іншай тэрыторыі тым ці іншым збіральнікам/збіральнікамі, а не на ўласна асаблівасці бытавання замоў. Каля 250 зафіксаваных лепельскіх замоў побач з 7 браслаўскімі сведчыць найперш пра даследаванасць раёна і ўжо толькі затым пра спецыфіку функцыянавання і ступень пашыранасці замоўнай практыкі.

Найперш колькі заўваг адносна запісу замоў у сучасных умовах, што наўпрост карэлюе з самой традыцыяй бытавання замоў і іх міжпакаленнай трансляцыі.

Перадача майстэрства магла ажыццяўляцца не толькі ў спадчыну ў межах сям'і, але і суседзям, проста блізкім і аднаведным, на думку шаптухі, людзям. Адзін з важнейшых прынцыпаў перадачы ведаў – вучань мусіў быць маладзейшым за настаўніка і па магчымасці быць найменшым або найстаршым у сям'і («Еслі б вы за мяне старшая была, я б вам не расказала. А раз маладзейшая, можна расказаваць і паўчыць можна»[1]). Цікава, адным з фактараў перадачы ведаў выступала, як гэта не дзіўна, добрая памяць пераемцы. Гэта вытлумачальна з пункту гледжання непісьменнасці ў былыя часы, аднак асобныя выпадкі дазваляюць меркаваць пра добрую памяць як асаблівы сакральны дар. Так, Ксеня Скорба, вядомая на ўсю акругу знахарка з в. Сітнікі Лепельскага р-на, пра сваё навучаннне расказала такую гісторыю. У гады вайны праз вёску ішлі бежанцы, і яна, тады яшчэ маладая дзяўчына, прыхінула старую, дала ёй паесці, і перапранууца, і нешта з сабою. У падзяку тая цэлую ноч пераказвала ёй замовы (а замовы бабы Ксені – разгорнутыя, большай часткай эпічныя сюжэты, якія, дарэчы, некалькі вылучаюцца на агульналепельскім фоне). Замовы засталіся ў памяці. Гл. таксама каментарый знахаркі з Бешанковіцкага р-на: «А залатнік, рожа, я часта ліжала ў бальніцы, там былі такія старухі. І вот яны тады: Валька, давай цябе будзем вучыць, раз ты такі доктар. Нескалькі разоў перагаворуць. А я тады паўтару. А я вот адну вучыла, ліжала ў Бішанковічах, яна прасіла: Баба Валя, навучы мяне ад рожы. Я ей нагавару, а яна назаўтра ўстанець і нічога: Ішоў Гасподзь полем... А куды пашоў – ні знаю. А я аж зругаюся: якая ты непамятлівая»[2].

Поўдзень цэнтральнай Віцебшчыны наогул вылучаецца адкрытасцю замоўнай традыцыі. Інфармантки не толькі ахвотна пераказваюць замовы, але і імкнуцца да перадачы ведаў. Надзея Важанава, 1935 г.н., з в. Будзілава Бешанковіцкага р-на пераказала мне свой замоўны арсенал, а затым, надзеўшы акуляры, старанна перачытвала мой нататнік – ці ўсё я запісала правільна – «каб жа памагала».

І яшчэ адзін немалаважны фактар – далучанасць пераемніка да царквы, веры, ахрышчанасць. «Нада верыць Богу. Прынясуць грошы ці хто што. Я іду ў царкву, стаўляю свечкі. Я ж Бога прашу, каб Бог памог. Вот я і стаўлю свечку і ў скарбонку кідаю грошы. Нада пераказаваць таму, хто верыць і хто хочыць. Нада дзяржаць у душэ»[3]. Семеж Марыя, шаптуха з в. Валынцы Верхнядзвінскага р-на, свой сшытак з замовамі асвяціла ў царкве – «Эту цетрадку бацюшка асвяціў у царкве. Я з ім пагаварыла: ці можна эта. Ён паглядзеў: можна, эта ж спасаеш ты»[4].

У шэрагу выпадкаў/раёнаў веды перадаваліся перад смерцю, пераказаныя раней часу і чалавеку старонняму прыводзілі да страты знахаркай яе моцы. Так, адмаўляліся пераказваць свае замовы лекаркі з Віцебскага р-на, неахвотна гэта рабілі з Талочынскага. У Чашніцкім р-не не сталі пераказваць замовы актыўна практыкуючыя маладзейшыя знахары, у той час як старэнькая бабуля Таня (Т.І. Гаспадарык) надыктавала старанна і ахвотна.

Варта агаварыць тую акалічнасць, што без роздуму перадаюцца магічныя формулы, прыгаворы, якія суправаджалі тое ці іншае рытуальнае дзеянне. Разгорнутыя замовы, якія базуюцца на сакральнай моцы ўласна слова, часцей практыкуючымі моцнымі вылучанымі знахарамі не пераказваюцца і належаць да каштоўнай эзатэрычнай веды. «З'яўляючыся немалаважным фактарам, што абумоўліваў размеркаванне сацыяльнага статусу і дабротаў, а значыць аўтарытэту, уплыву і ўлады, замоўныя тэксты выступалі ў якасці значнай каштоўнасці, складалі своеасаблівую інтэлектуальную ўласнасць» [2, с. 78].

Такім чынам, ёсць пэўныя рэгіянальныя асаблівасці ў самім працэсе перадачы сакральных ведаў, аднак спецыяльныя доследы ў гэтым плане не праводзіліся і гэта толькі папярэднія назіранні, большасцю з уласнага збіральніцкага вопыту.

**Асаблівасці структуры замоў Віцебшчыны**

Падзвінскія замовы ўяўляюць сабою даволі неаднародны кантынуум – ад невялікіх заклінальных формульных тэкстаў да разгорнутых эпічных структур, якія, аднак, пераважаюць у раёнах, адносных да

[1] Зап. Т. Валодзіна ў 2007 г. у в. Слабада Ушацкага р-на ад Каваленка Таццяны Ягораўны, 1935 г. нар.
[2] Зап. А. Боганева і Т. Валодзіна ў 2006 г. у в. Сокарава Бешанковіцкага р-на ад Лабацёнак Валянціны Сямёнаўны, 1928 г. нар.
[3] Зап. у 2005 г. Т. Валодзіна ў в. Марцінава Верхнядзвінскага р-на ад Ламінскай Ніны Мікалаеўны, 1931 г. нар.
[4] Зап. у 2005 г. Т. Валодзіна ў в. Валынцы Верхнядзвінскага р-на ад Семеж Марыі Мітрафанаўны, 1920 г. нар.

зоны Падняпроўя. Прымяняльна да класічнай лекавай замовы можна вылучаць малітоўны ўступ, наратыўную частку і закрэпку. Разам з тым абсалютная большасць тэкстаў на Віцебшчыне ва ўсялякім разе запісаная без малітоўных уступак і закрэпак, а адразу ідзе наратыўная частка або зварот да хваробы. Аднак варта агаварыцца, што ў рэальнай практыцы кожная знахарка можа скарыстоўваць свае зачыны і закрэпкі, не лічыўшы іх адноснымі да канкрэтнай замовы, пра якую яна апавядае. Тым не менш у параўнанні з іншымі рэгіёнамі вялікая колькасць віцебскіх замоў выглядае як адначастковая структура.

Вельмі ўмоўна ўвесь корпус замоў можна падзяліць на сюжэтныя і вакатыўныя (зваротныя), хаця існуе вялікая колькасць тэкстаў, дзе разгорнуты сюжэт затым уключае зварот да хваробы, а замова, якая з вакатыву пачалася, заканчваецца кароткім пазначэннем сюжэтнай сітуацыі. Вакатыўныя замовы – невялікія па аб'ёме, складаюцца з аднаго-трох сказаў, часам пабудаваныя па прынцыпу падабенства «як адбываецца гэта, каб гэдак адбылося тое».

Круг, лішай, ідзі сьвінням мяшай.
Свярбіць, шчакочыць, уміраць ня хочаць.
Як хросная мамка пад крэст станавіла,
у Бога долі-шчасьця прасіла, круга не спамінала,
каб целца век круга не знала.
Амін[1].

У гэтай групе звяртаюцца канкрэтна да адной хваробы, мадальнасць звароту разгортваецца ад просьбы да пагрозы, хваробу просяць выйсці ці катэгарычны выганяюць.

У Падзвінні дамінуе менавіта вакатыўны тып замоў. Прыблізна дзве трэці вядомых тэкстаў уяўляюць сабою або наўпроставы зварот да хваробы, які не месціць ні малітоўных уступаў, ні папярэдніх заўваг (асабліва характэрна для замоў ад залатніка, пуду, грызі), або гэты зварот ідзе за рэмаркамі адносна шляху сакральнага персанажа ці іншымі ўводнымі канструкцыямі.

***Зачыны.*** Абсалютную большасць зачынаў падзвінскіх замоў складае зварот па дапамогу да хрысціянскага персанажа – «Святыя святочкі, гасподнія дзянёчкі, памажы, Божачка, ад залатніка. Я ж нікога не знаю, толькі Госпада Бога, Духа Святога, Ісуса Хрыста, мертвяца» *Леп.*; «Ва імя Айца, і Сына, і Святага Духа. Залатнік замаўляю, Бога ўспамінаю Пана Язуса, Найсвенцшу Матку. Бог памач, а я з духам». *Докш.*; «Дыхні, Госпадзі, сваім духам гасподнім. Стань, Госпадзі, на помач, рабе божае Ганне на пользу» *Лёзн.*; «Святы Юрый-Ягорый, Госпадзі Божа, благаславі. Святая Божая Маці, памажы і спасі маю скацінку» *Пол.*

Папулярныя на ўсёй тэрыторыі Беларусі «Першым разком, лепшым/Божым часком» даволі частотныя ў Шаркаўшчынскім, Глыбокскім, Лепельскім, Чашніцкім, Галочынскім, Аршанскім, Дубровенскім раёнах, а вось «Устану я раненька, умыюся я беленька» запісаны ў адзінкавых тэкстах (Бешанковічы, Чашнікі).

Сваімі разгорнутымі зачынамі вылучаецца паўднёвы ўсход Віцебшчыны, фактычна зона, блізкая да Падняпроўя, дзе на дапамогу заклікаюцца побач з Божай Маці, Госпадам Богам і Ісусам Хрыстом і шэраг іншых святых, дзён тыдня – «Дванаццаць царэй і дванаццаць каралей, і цара Давыда ўпрашаю і ўмаляю» *Дубр.*; «Першым разком, лепшым часком, з гаспадаром Богам, св. Юры, св. Мікола, матка Пакрова, памажы мне лячыць» *Арш.* Ва ўсходне-беларускіх замовах наогул малітоўны разгорнуты зварот па дапамогу да вышэйшых сілаў мог складаць цэлую замову. Паказальна і тое, што пералічэнне ўсіх святаў календару разгортвала цэласнасць каляндарнага цыклу, што магічна скіроўвалася на паўнату жыццёвае моцы хворага – яго ацаленне: «Святое Благавешчанне, святое Хрышчэнне, бацюшка-цудатворац, Дух, Тройца, Купала Іван, Казанская Божая маць, Ільінская Пятніца, Ілля, Макавей, Спас, Бугуродзіца, Пакроў, Устрэчанне, благаславі. Святая маць Бугуродзіца, святоя Ражаство, святой Сірахім, святой Іван, святыі апосталы, усе памоцьнікі, Госпадзі, памагіце, я памагаю і вы памагіце» *Гарад* [1, с. 311].

Даволі частотны зварот да зары – «Зара-зараніца, ранняя (або вячэрняя) памашніца, памажы, Божа, (імя хворага)» *Леп.*, *Арш.*,*Гал.*, вышэй на поўнач звяртаюцца да зары-зарніцы (Уш. і Пол.). Як закрэпка выступае формула «Зара прападаець/затухаець, так у... хвароба прападаець» (Беш., Глыб., Пол., Уш.), у Аршанскім р-не, наадварот, акцэнтуецца падыманне зары – «Святая зарыца, ад Госпада Бога памачніца, як зара падымаецца, так расход рукі ўстанаўляецца» *Арш.* Варта пазначыць, што і зварот да зары ў абсалютнай большасці выпадкаў дапаўняецца зваротам да хрысціянскага персанажа – «Первую зару замаўляю, Госпада Бога ўпрашаю» *Арш.*, «Госпадзі Божа, благаславі, Святая Бож'я Маці, памажы. Зара-зарніца, усяму свету памашніца, памажы-пасабі загаварваць» *Пол.*

Класічны разгорнуты зачын, прысвечаны вадзіцы-ачысціцы, якая абмывае ўсё наваколле і гэткім жа чынам ачысціць чалавека ад сурокаў, катэгарычна падзяляе Віцебшчыну на дзве часткі, амаль пасярэдзіне, гэты матыў вылучае ўсходнюю зону. На Полаччыне ў пачатку XX стагоддзя А. Шлюбскім запісаная разгорнутая эпічная замова, якая распачынаецца ад просьбы да вадзіцы, затым пераходзіць да просьбы іншым стыхіям аж да ўлагоджання духаў прасторы. Гэтая замова па праву можа быць аднесеная (па-за

[1] Зап. А. Боганева і Т. Валодзіна ў 2006 г. у в. Сокарава Бешанковіцкага р-на ад Лабацёнак Валянціны Сямёнаўны, 1928 г. нар.

належнай ёй прагматыкай) да ўзораў народнай паэтычнасці і выступае як узор арганічнай суладнасці з прыродай: «Царыца-вадзіца, красная дзявіца, марская крыніца, божжа памачніца, і ўгодніца Ульяніца, і румяніца, рака вялікая. Коцішся ты, вадзіца, па дням, па начам, па вячэрнім зарам, ідзеш з-пад крутых гор, з-пад красных зор, з-пад жаркага сонца, з-пад яснага месяцу, з-пад Латыра-камню, (па) тонкім жылам, марскім сілам. Падмываіш ты крутыя берагі, жоўтыя пяскі, калоды валяныя, траву шаўковую, вымываіш сыроя карэння, белая каменя; абмуваіш камішкі дробныя, крамення чорныя і жалеззя марскоя цяжкоя. Ачышчаіш цароў, каралёў і ўвесь народ хрысьціянські, абмый і сцалі рабу гэту нядужную ад першага вока аднавокага, і ад карага, і ад ярага, і ад белага, і ад шэрага, ад стрэчнага, ад пупярэчнага, ад падзіўнага і пасьмешнага, ад падумнага і пагляднага, ад прыгаворнага і набродната, ад галоснага і ад злоснага, ад завіснага і ад радаснага, ад вадзянага і сухавейнага, і скразіцельнага, і скрозьшлотнага, і сьветавога, і агнявога, і гаравога, і палявога; ці схода, ці маладзіка, ці пад поўная; ад часіны, ад хвіліны, і дзённага, і ночнага, і ранняга, і вячэрняга, і паўночнага, і паўдзённага, і радзімага, і насыланага, і падымнога, і сьветавога, і калючага, і балючага, і ламучага, і гаручага; ці панскага, ці цыганскага, ці дзякоўскага, ці жыдоўскага, ці мужчынскага пад вянцом, ці жаноцкага пад чапцом, ці хлапецкага пад шапачкай, ці дзявоцкага пад завіткай, ці ўдовіна, ці ўдаўцова, ці дзядова, ці бабіна, ці бацькіна, ці маткіна, ці братава, ці сястрына, ці рабячага, ці сабачага, ці дзядзькіна, ці цёткіна, ці ад старых старыкоў, ад старых старушак, ад ведзьмінскіх ічараўніцкіх і таго біззаконнага ўдовіна наваражджэнца, які два разы маць сасець; і на чым бы яны ні былі: на піцянні ці на ядзянні, на гулянні-красаванні ці на мяккім спачыванні» [3, с. 37 – 38].

Заходне-падзвінскія замовы, лаканічныя самі па сабе, і малітоўны зачын (які сустракаецца вельмі рэдка) маюць адпаведны – «Прасвятая Багародзіца, дапамажы» *Брасл.*; «Памажы, Божа і святы панядзелак (ці які там дзень) ад...» *В.-Дз.*

Формулы недвухсэнсоўна канстатуюць вызначальную ролю ў лекаванні менавіта Бога і толькі пасярэдніцкую шаптуна: «Я з словамі, Бог з духамі, як стала, так перастала» *Пол.*; «Бог з помачу, баба з варажбой» *Тал.*, «Я са словам, а Бог з дапамогай. Хух, Божы Дух!» *Чаш.*; «Я – з духам, а Бог Ісус Хрыстос із помаччу. Не я памашніца – Госпад Бог, а мой лёгкі дух» *Чаш.* Такія формулы характэрныя як для зачынаў, так і для канцовак – «Госпадзі, не я памагаю, а дух мой, а я толькі гляджу» *Беш.*; «Дай Гасподзь Бог на помач, а я на радачку» *Беш.*, «Бог помач, а я з духам» *Докш.*, *Чаш.*, «Бог з дапамогай. Я з духам. *Тал.*; Бог з помаччу, я з духам. *Чаш.*, *Тал.*, *Уш*; «Бог з помаччу, я з душой» *Тал.*; «Дай, Гасподзь, на помач, а мой сьвяты дух. *Уш.*; «Бог на помач, мой лёгкі дух» *Чаш.*

***Закрэпкі.*** У закрэпках канстатацыя не сваёй – вышэйшай – дапамогі рэалізуецца ў наступных варыянтах: «Не сам я сабой – Гасподней помаччу, нябеснай калясніцы» *Віц.*, « І цур табе хрышчонага і нараджонага, Спасіцель у помач. А мае рыкі ды дух» *Тал.*; «Мой дух, Найсвенша Матка, Ісус Хрыстос» *Чаш.* Для докшыцкіх замоў характэрная закрэпка «Бог да помачы, а я да рады». Многа часцей у завяршэнні замаўлення яшчэ раз выпрошваецца дапамога ў вышэйшых сіл – «І ўсі празьнічкі, божыя ўгоднічкі, памажыця мне ў карысьці, у радасьці, у добрым здароўю. Вячэрняя зара, палуношная зара і светавая зара ўвесь свет сакрашалі і Госпадам Богам памагалі» *Дубр.*; «Стань, Госпад, Найсвеншая Матка, на помач», «Гасподзь Бог на помач, ангелы на радасьць» *Беш.* і інш.

Акцэнтацыя ўласнай дапамогі вельмі рэдкая і практычна нідзе не выступае асобна – «Пастаўлю сваім сьвятым духам. Амінь!» *Докш.*; «Госпадзі, памагі, я памагаю і ты памагі» *Гарад.* І толькі ў асобных замовах можна сустрэць катэгарычны перфарматыў «Я цябе словам убіваю» *Леп. Чаш.*

У гэтым кантэксце вельмі цікавая замова з Мёрскага раёна, дзе знахарка прыраўноўвае сябе да Божай Маці, сімвалічна прымае на сябе яе функцыі ў лекаванні хворага.

*Малітва да Прачыстай Маткі Боскай.*

Дапамажы (імя каму) упуд адганяць.
На рацэ сяджу, на бягучую ваду гляджу.
На чыстую, на ўпудную.
Благаславі, Божа, узяць і мне (імя) раду даць.
Я, Найсвеншая Матка, на камяні сяджу,
На ўпудную ваду гляджу,
Шоўк вышываю, упуд замаўляю.
Маўры-гаўры. Фу-Фу-Фу. (3 р)[1].

З адзінкавых, але вартых увагі закрэпак – «Кажу я сваімі вуснамі, якімі прымала святое Прычасце, каб было ў ... помач» *Уш.*; «Ісус Хрыстос, явіся, уся суроца ўніміся» *Дубр.*, «Хрыстос васкрэс, Хрыстос васкрэс, Хрыстос васкрэс!» *Пол.*; «Не я памагаю, Гасподзь памагаець. Капцы этай хваробе» *Пол.*;

[1] Фальклорны архіў Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта: зап. М. Пракулевіч у 2003 г. у в. Цвеціна Мёрскага р-на ад Веры Іванаўны Дземянчонак, 1918 г. нар.

«Ох, Божухна, стань на пуць, а злый дух – на муць» *Пол.* У якасці і пачатку і канца падзвінскіх замоў вельмі папулярныя просценькія формулы «Памажы, Божа», «Бог, на помач».

***Паратыўная частка.*** Безумоўна, віцебскія замовы з'яўляюцца арганічнай часткай агульнабеларускіх і, шырэй, усходнеславянскіх, выяўляюць вялікую колькасць паралеляў з замовамі суседніх народаў. Гэтае падабенства заснаванае перадусім на універсальных прынцыпах пабудовы замовы, сярод якіх прыпадабненне, зварот да хваробы з пагрозамі, просьбамі, адсылкамі, прапановамі, апісанне дзеяў самога знахара ды зварот па дапамогу да іншых персанажаў. Спецыфіка можа быць выяўленая ў пераваЗе і найбольшым развіцці той ці іншай сюжэтнай лініі.

Сярод прысутных частотных матываў вылучаюцца: пералічэнне частак і органаў цела (... «пуд выбіраць з русых валасоў, з светлых воч, з белай касці, з чырвонай крыві, з-пад локцікаў, з-пад ногцікаў»), адкуль хвароба мусіць быць выдаленая, і выразнае фармуляванне локусаў адсылкі хваробы, сярод якіх вылучаюцца месцы, адкуль хвароба і паходзіць, фактычна той свет – «Ідзі ты, грыжы, на мхі, на балоты, на ніцыя лозы. Дзе пцічкі не пяюць, петушыны голас не даходзіць і дзе людзі не ходзюць» (Леп.). Характэрна для замоў ад пуду, ад скулы. Пазначэнне магчымых прыстанішчаў хваробы ў целе як сюжэтаўтваральная канструкцыя мае асобны магічны змест, акрамя першаснага імкнення не прапусціць магчымых месцаў лакалізацыі хваробы, бо сустракаецца ў тэкстах ад тых немачаў, якія ў прынцыпе маюць канкрэтную прывязку да цела.

У параўнанні з заходнепалескімі замовамі звяртае на сябе ўвагу многа меншая распаўсюджанасць дыялогавай структуры ў тэкстах сюжэтнага тыпу (там гаворку між сабою вядуць сакральныя персанажы ў шляху да хворага), у дадзеным выпадку рытуальны дыялог суправаджае і вытлумачвае магічныя дзеі – пры паланні дзіцяці пры начніцах, пры выгрызанні грызі і, што асабліва папулярна, у дыялогу з месяцам пры болю зубоў.

Матыў міфалагічнага цэнтра ў замовах Віцебшчыны займае даволі значнае месца. Цэнтр прэзентуе дзве сферы светабудовы: месцазнаходжання сакральнага персанажа, які сваімі пэўнымі дзеямі дапамагае хвораму, і цэнтр антысвету, прытулак хваробаў, куды адсылаецца і дзе чакаецца немач аб'екта замовы.

Сакральны цэнтр прадстаўлены ў наступных канфігурацыях яго канцэнтрычных складнікаў і насельнікаў: <у чыстым полі> на сінім моры (белы) камень/<прыстол (з кубкамі паналіванымі)>, на ім Божая Маці чытае кнігу (ад пуду, *В.-Дз.*), бярэць ключы залатыя, «замыкае злому духу рукі, язык і мову і кідае ў сіняе мора» (*В.-Дзв.*); у Пол. спасае ад сурокаў і выкідышу; «кубкі мыла, шоўк сучыла, шоўк расшывала, уроцы зашывала» (Уш.). І нават «на пяньку Найсьвенша Матачка тонкі кужаль прадзець» (ад залатніка, Докш.) Такія здольнасці ў рукадзеллі прыпісваюцца і іншым жаночым персанажам, якія ў цэнтры дапамагаюць хвораму: гэта могуць быць тры сястрыцы (дзявіцы)-рукадзельніцы, якія сваімі дзеямі выбіраюць сурокі/рожу (Арш., Дубр.); на камені сярод мора тры панны Ганны матаюць красны шоўк (Віц.); «там на моры, на лукамор'і злішныя панны гулялі і ўроцы вымывалі» (Дубр.); «дванаццаць сясцёр платкі шыюць, вышываюць, дванаццаць рожаў замаўляюць» (Мёр); на камені Латыры дзяўчынка тчэ шаўковы кужалёк (ад крывацёку, Шум.); тры сястрычкі над яблынай: «адна шыла, другая вышывала, трыцяя зьвіх вымаўляла» (Чаш.); «А на моры стаіць ложа, прыбранае, засланае, на тым ложы ўдавіца, у ўдавіцы тры дзявіцы: адна тонка прала, адна часта ткала, адна трубкі качала, суставы сустаўляла» (Тал.)» на моры бел камень, на ім царква – прэстол – паненка – «нічога не знаіць, не маіць – толькі ад уроцы памагаецъ» (Чаш.). «На моры, на акіяне, на востраве, на Буяне стаіць саборная апостальская царква, стаіць Маці Святая Багародзіца і прыпадобны Анцыпій» (Докш). «Шол Ісус Хрыстос чэраз сіняе мора, на тым моры высака цэрква, на той цэркві крэст, на тым красце святы Пётр, святы Фабіян, святая Тройца, едзіны» (ад рожы, Беш.); «На моры ляжыць камень Імператар, на тым камні 12 ключкоў і 12 замкоў. На тым камні сядзіць дзедбеладзед, нічэво не есьць, нічэво не п'еiць – толькі с этага жывець» (ад урокаў, Рас.); «На сінім моры стаіць купіна, на той купіне стаіць драбіна. На той драбіне сам Гасподзь Бог. С кадзілам выкажае, вымаляе, нячыстую сілу выганяе з раба божага» (ад пуду, Рас.).

У падзвінскіх замовах міфалагічны цэнтр пазначаецца адразу і практычна адсутнічае апісанне шляху да яго. У самім цэнтры дзейнічае перадусім сакральны персанаж, з'яўленне там суб'екта замовы – у адзін-кавых тэкстах.

Ландшафтныя зоны першага ўзроўню прадстаўленыя ў абсалютнай большасці морам (усе раёны), поле сустракаецца толькі некалькі разоў, рака толькі ў словазлучэнні «акіян-рака», адзінкавы запіс – Дунай. Лес як прастора антыцэнтра, дзе месцяцца самі хваробы, зафіксаваны ў замове ад рожы (Докш.) і ад скулы (Арш.), хаця ў цэлым сакральны статус лесу на Падзвінні вельмі высокі, што дазволіла ў адметнай вайсковай замове звярнуцца наўпрост: «Святы Божа, лес зялёны. Спасі мяне. Спасі. Спасі ад шашак алавянных, нажоў вострых, злога вока, ад вады студзёнай, ад пулі паганай і ад усякай бяды»[1]. Цэнтр першай буйной зоны маркіруецца востравам і ў двух запісах гарой. Паказальна, з'яўленне вострава пераважае ва ўсходне-віцебскіх замовах, там жа сустракаецца і назва вострава – Буян.

[1] АНДЛ: зап. у в. Каханавічы Верхнядзвінскага р-на ад Курклінскай Ганны Карпаўны, 1917 г. нар.

На другім узроўні (у канцэпцыі Т. Агапкінай [4]) змяшчаюцца сакральныя культавыя аб'еты: прыроднага паходжання – *камень, дрэва/куст,* ці рукатворныя (хрысціянскія) – *царква, касцёл;* у адзінкавых выпадках мірскія аб'екты – *дом, хата.* Па частотнасці абсалютнае першае месца належыць каменю. Дрэва сустракаецца пераважна ў замовах ад змеяў, там гэта можа быць іва, ракітавы куст, у большыні выпадкаў у міфалагічным цэнтры расце дуб і ні разу – у адрозненне ад іншых зонаў – ліпа, груша, у адзінкавых замовах – яблыня і бяроза. Трэці значны культавы аб'ект другога ўзроўню – царква – не з'яўляецца частотным (7 фіксацый супраць 43 для каменя); касцёл сустракаецца толькі ў двух выпадках. З больш дробных і рэдкіх адзнак цэнтра ў падзвінскіх замовах зафіксаваныя: прастол і ў некалькіх выпадках крыж і крэсла/краваць. Цікава, прастол у шэрагу запісаў сустракаецца адразу ў моры, на востраве, без папярэдняй узгадкі царквы, часцей на камені, што паказвае на іх семантычную блізкасць. Ва ўсходняй палове Віцебшчыны фіксуецца ўзгадка каменя Латыра.

Т.А. Агапкіна на падставе аналізавання значнай колькасці ўсходнеславянскіх замоў выказала гіпотэзу, што матыў міфалагічнага цэнтра ў варыянце *мора – (востраў) – камень – царква* мог, хаця б у пэўнай ступені, сфармавацца пад уплывам астраўной культуры Рускай Поўначы, дзе святыні і культавыя аб'екты ўзводзяцца і размяшчаюцца на аддаленых астравах. У той жа час у паўднёваруска-беларуска-ўкраінскім варыянце матыву ў сакральны цэнтр змяшчаецца дрэва як асноўны культавы аб'ект гэтай часткі Усходняй Славіі [4, с. 281 – 283]. У падтрымку такога тэзісу даследчыца прыводзіць наступныя аргументы: адсутнасць у беларуска-ўкраінскіх замовах папярэдняга матыву шляху; размыванне рэгулярнасці сакральных міфатапонімаў тыпу Сіянская гара, Буян, Латыр і г.д.; з'яўленне новых аб'ектаў другога ўзроўню тыпу горад, лес, курган; змяшчэнне матыву ў межах аднаго тэксту побач з іншымі матывамі і не заўсёды на першым месцы, як на Рускай Поўначы; набыццё цэнтрам функцый антылокуса, тады як у паўночнарускай традыцыі ён вытрымлівае статус сакральнага цэнтра. Калі ў рэчышчы ўсяго вышэйзгаданага паглядзець на замовы Віцебшчыны, то можна адзначыць захаванасць перадусім на ўсходзе вобласці (на агульнабеларускім фоне) асобных паўночнарускіх рысаў, аднак з тэндэнцыяй да размывання ядра матыву.

Персанажны ровень сюжэтнага тыпу «міфалагічны цэнтр» прадстаўлены цэлым шэрагам сакральных памочнікаў, цэнтральнае месца сярод якіх належыць хрысціянскім персанажам. На першым месцы – Божая Маці, вобраз якой сустракаецца ў замовах практычна ад усіх хвароб. Рэгіянальная адметнасць хіба ў яе найменні: Найсвенцая Маці/Матачка ў заходніх раёнах, Прысвятая Багародзіца – ва ўсходніх (Гар., Шум.). Значна радзей у сакральным цэнтры знаходзяцца Госпад Бог, Хрыстос і, што цікава, яго вобраз суседнічае з дрэвам, полем – «У ціхім полі Дунай, у ім прыстол – Госпад Бог сядзіць, каля яго Ісус Хрыстос, Маці Багародзіца... аб уроцы гукаюць» (Пол.); «за сінім морам дуб, пад дубам прастол, на прастоле скацерць. Там сам Госпад Бог сядзіць» (Пол.); на востраве на прастоле Госпад не шые-вышывае (!), а «чараўнікоў адганяе, залатой пугай па вадзе памахае, сыр-масла наганяе, сыроватку на ваду пускае» (Уш.).

З іншых персанажаў сустракаюцца як старцы, так і святы і птушкі: на камені-алатыры тры старцы з жалезнымі пугамі, якія ўшчуваюць 12 сёсцёр-ліхаманак (Арш.); «За ракамі агні гараць, за агнямі сталы стаяць, за сталамі святыя гадавыя праздзяйкі сідзяць, кнігу дзяржаць і чытаюць і злодзееў, і чарадзееў ссылаюць» (Докш.); «Ёсць на белам свеце акіян-рака, на той рацэ стаіць дуб, на том дубе сядзелі тры вароны чорныя. Яны гаварылі...» (Дубр.); «на сінім моры камень, на камені дубок, на дубку трыдзевяць катоў, на тых катах трыдзевяць гняздоў, на тых гняздах трыдзевяць сарок, трыдзевяць урок – ад жаноча...» (Пол.)

У архаічнай ахоўнай замове міфалагічны цэнтр пераносіцца непасрэдна ў хату лекара/хворага – «У маём домі ні долі, ні волі, – прастол на прастолі; на тым прастолі латрый-камень, на тым камні Мікіта-мучанік; а перад ім стаіць сам Сус Хрыстос, а перад ім стаіць маць Прасвятая Бугуродзіца: сцеражэць, беражэць, – у дзень на работкі, у ночкі на пасцелькі, пад красным сонцам, пад ясным месяцам, пад лунным лунам, пад частым звездам. Амін» (Гарад.) [1, с. 51].

Разам з тым у шэрагу замоў хаця і наступлюецца наяўнасць цэнтра, актыўнасць у лекаванні прама заяўляецца самім выканаўцам: «на моры, на Іардані ляжыць камень Ла́дан, на ім сам Гасподзь Бог, Ісус Хрыстос з усімі сваімі апосталамі», але *Зганяю, здуваю ўрага-супастата* (Пол.) «На сінім моры стаіць дуб, на тым дубе дванаццаць сучкоў, на тых сучках дванаццаць гняздоў, а ў тых гняздах дванаццаць яец». Але «**Я** гнёзды яец знімаю, падвея аднімаю, Госпада Бога на помач прызываю...» (Тал.).

Хваробы сваім цэнтрам маюць гэтаксама канцэнтрычна ўкладзеныя локусы, самым першым аддаленым локусам можа выступаць і сіняе мора: рожавая маці на моры збірае да сябе сваіх ражанят з хворага (Арш.); – «пану-басурману»прапаноўваецца «серы конь і залатое сядло», каб паехаць да паненак, якія гуляюць у сінім моры ў карты; «На моры, на лукамор'і стаяў куст ракітавы, а ў тым кусце ляжала змяя Шкурапей» (Уш.); «Стаіць акіян-мора, за акіянам – астроў. На астраве – іва. На іве – чорна руно. На чорным руне – зьмяя Шкарлупея» (Шум.), але ў выпадках з хваробамі ўсё часцей з'яўляецца чыстае поле, хай сабе за морам – «У чыстым полі на сінім моры стаіць дуб шыракаліст, пад тым дубам воўцы стары, пераяры, чорная воўна. На тэй воўні ляжыць змяя змяіная (Гарад.); «На востраві на Сакалоні стаіць дуб, а на тым дубу дванаццаць кокатаў, а пад тым дубам дванаццаць галубоў. ...на сінім моры ляжыць камінь, пад тым камянём ляжыць дашка, а пад тэй дашкой ляжыць мая таска» (Пол.); «у чыстым полі явор стаіць, пад тым яворам твае сястрыцы сідзяць, сталы засцілаюць і цябе дажыдаюць» (Слабада);

«пад белу бярозу – там дванаццаць грызь п'юць, гуляюць, трынаццатую дажыдаюць» (Старына); у чыстым полі дуб, пад ім 12 залатнікоў прастолы засцілаюць, адпачываюць і чакаюць (Пол.). Звяртае на сябе ўвагу той факт, што антылокус амаль кожным разам маркіраваны вобразам дрэва ў адрозненне ад каменя, на якім знаходзіцца сакральны вышэйшы песанаж.

Згодна з назіраннямі Т.А. Агапкінай, на агульнаўсходнеславянскім фоне толькі рэдкія замовы змяшчаюць у міфалагічны цэнтр самі хваробы або міфалагічны цэнтр асэнсоўваецца як тагасветавая прастора, локус немачаў [4, с. 276]. Аднак у замовах Віцебшчыны гэтая прапорцыя некалькі іншая: тэкстаў з матывам «хвароба знаходзіцца або адсылаецца ў антыцэнтр» не на шмат меней, чым з «класічнай» схемай знаходжання там сакральнага памочніка, прычым такія замовы фіксуюцца ў адных і тых жа раёнах.

Матыў *шляху міфалагічнага персанажа* прадстаўлены ў замовах ад большыні хвароб і па ўсёй тэрыторыі вобласці. Шлях сакральнага персанажа, яго сустрэча з хваробай ці іншым персанажам уяўляе сабою вельмі старажытны сюжэт, які мае паралелі яшчэ ў асірыйскіх заклінаннях. У тэкстах з Віцебшчыны распрацоўваецца матыў шляху міфалагічнага персанажа, дзеянні якога працыруюцца ў свет хворага і тым выклікаюць яго выздараўленне. У замовах ад звіху гэта пашыраны кругом матыў шляху або паездкі Бога/Госпада/Ісуса Хрыста/Юрыя/Архайлы/Даніла ці самога звіха на вараным/сівым/залатым кані праз залаты/калінавы/жалезны мост. Спатыкаецца конь або сам персанаж/угібаецца мост – звіх становіцца на месца. Гл. адрознае – «Ехаў Бог па полю на сівым каньку, выламаў галінку. Табе, галінка, не шумець. А гэтай косці не балець» (Мёр.) або» Ехаў персанаж, вецце ламаў, раны затыкаў (Глыб.); «Ехаў Бог па небесах, на срэбраных калясах». Іншы блок міфічнага падарожжа – паездка цара на вайну з Богам (Глыб.), адпачатковая безвыніковасць якой найлепшым чынам праграмавала і знікненне болю.

Гэтаксама матыў шляху сакральнага персанажа шмат разоў паўтараецца ў замовах ад рожы, калі тры кветкі (у Глыб. не толькі тры ружы, але і юргінію, півонію і ружу) нясе/знаходзіць Божая Маці/Хрыстос («святыя ангелы падбягаюць, ружу-красачку аднімаюць» (Чаш.)). Кроў унімаць ідуць Мікола, Ягор'я і Міхайла са сваімі вострымі мячамі ці Гасподзь з залатым крастом (Арш.); на шляху Хрыстос сустракае тых, што «секліся, біліся, там і кроў лілася» (Докш.), а за ім «дванаццаць апосталаў, дарожку пяском пасыпалі, каб дванаццаць змей не кусалі» (Уш.).

Як найпершая памагатая ў хваробах бачыцца Божая Маці, калі ў замовах апісваецца яе шлях і тое, што яна «костачкі састаўляла» (Гняздзілава) або выздараўленне чакаецца ў выніку пэўнага яе ўчынку – «Ішла Найсвеніша Матка па чыстаму полю, несла чашу. Чаша ўпала – косць на месца стала» (Чаш.). У сваім замоўным падарожжы Маці Божая рыхтус магічнае зелле: «па бару хадзіла, траўку-мамку сабірала, 20 рож і скул замаўляла» (Пол.).

Асобны блок складаюць замовы з *міфалагічным прэцэдэнтам*: Божая Маці спяшаецца да хворага Ісуса Хрыста, дапамагае яму і гэта магічна спрыяе ацаленню хворага: «Насвенша Матка па небу хадзіла, Сынка свайго за ручку вадзіла. Прывяла: «Ах, Сынку ты мой пралюбезны, сваёй Маці прыбалезны». «Ах, Матачка ты мая, прыцерпіў раны свае... » (Мёр.); «Ішла Найсвяцейшая Матка па бару, несла Ісуса Хрыстоса ў падалу, Ісуса Хрыстоса змывала, ад сурокаў, нагавораў радыпомачы (імя) давала» (Чаш.). Радзей сустракаецца матыў шляху Божае Маці да Ісуса, які параніўся (Дубр.). Залатнік вызывае з цела «Найсвенша Матка на Дунаі» або «Насвеншая Матка па саду хадзіла, Ісуса Хрыста радзіла, у яслях страдала, а труду не знала, у крэсле сядзела, залатніка на месці пастанаўляла» (Пол.). Адсутнасць болю праграмуецца на ўзор вытрымкі Божай Маці – «Ішла Найсвентшая Матка, Святая Багародзіца па бальшых гарах, па высокіх мастах. Масты абламіліся, горы праваліліся. Найсвентшая Матка, Святая Багародзіца эні раны здзержала і балезні не знала» (Пол.).

Сюжэт сустрэчы Божае Маці з іншым персанажам ці хворым – у падзвінскіх замовах вельмі і вельмі рэдкі, гл., да прыкладу, «Ішла Насвенчая Матка па мяжах, сустрэла царыцу на крастах: – Што ты, царыца, сабіраеш? – Сабіраю жылачкі, костачкі, суставачкі, каб гэтыя жылачкі, костачкі, суставачкі на месца сталі, балець перасталі» (Чаш.). З іншых жаночых персанажаў на дапамогу спяшаюцца тры дзявіцы, якія «рвалі тры травіцы. Першая – зелье краснае, другая – зелье жоўтае, трэцця – зелье белае» (Докш.) [2, с. 98 – 99].

Замовы ад залатніка актыўна распрацоўваюць матыў шляху самое хваробы, калі залатнік ідзе сам «па залатому масту, спускаў свае косы па сырой траве, па сырой зямлі», «ідзі па залатых дарожках, па залатых кусточках, па залатых масточках, па залатых сцежках» (Уш.). Разам з залатнікам «Бог ідзе мяжой» і тады «як Гасподзь Бог на прыстоле стаў, так залатнік Раманаў на месцы стаў» (Уш.). Замовы ад залатніка маюць і свайго адмысловага «падарожніка» – Яна Златавуста. З іншых хваробаў «ісці/хадзіць» можа нейкая невідзімка (Уш., Пол.), якая ў амаль даслоўных варыянтах аказваецца Праскоўкай, можа шукаць пражыўлення і знайсці яго сабе ў пупе (ад грыжы).

Заходнепадзвінскія замовы, арганізаваныя вакол матыву шляху, вылучаюцца сваёй лаканічнасцю і пазбаўленыя суправаджальных дэталяў і канструкцый. Варта тут адзначыць, што менавіта такая структура замоў характэрная для літоўскай традыцыі, для якой наогул не ўласцівая эпічнасць. «Літоўскія замовы, як правіла, статычныя, і матывы шляху, у асноўным, адпавядаюць запазычаным з заходнееўрапейскай ся-

Polotsk.su

рэднявечнай традцыі сюжэтам. Як правіла, гэтыя сюжэты не развіваюцца ў разгорнуты эпічны сюжэт, а ўяўляюць сабой кароткую канстатацыю факта: нехта ішоў, нешта здарылася, у выніку чаго боль знікла ці павінна знікнуць» [5, с. 235]. Гл. тут тыповыя браслаўскія замовы – «Ішоў Езус каля Усі. Ніхто яго не бачыў, няхай і мяне не ўбачаць» (ад сабак, Брас.); «Ехаў пан, вёз жбан, жбан пабіўся, вада палілася, і ў (імя) галаве боль унялася» (Брас.).

Калі ж спрабаваць акрэсліць пашыранасць асноўных матываў у складзе замоў Віцебшчыны, то на першым месцы адназначна змесціцца зварот да хваробы, на другім – матыў шляху сакральнага персанажа і толькі на трэцім – матыў міфалагічнага цэнтра. У рэгіянальных адносінах захад аддае бясспрэчную перавагу матыву шляху, матыў міфалагічнага цэнтра асабліва распрацаваны на паўднёвым усходзе, у зоне Падняпроўя.

З прасоўваннем на ўсход павялічваецца эпічнасць тэксту, што выяўляецца ў выразным пазначэнні прасторавай характарыстыкі дзеяння, імкненні вылучыць цэнтр і галоўнага дзейснага персанажа. Ды і сама палітра сакральных памочнікаў на ўсход становіцца ўсё больш і больш разнастайнай. Да Божай Маці, Бога і Ісуса Хрыста на захадзе тут далучаюцца дзеўкі, баба, дзед-беладзед і інш. Паказальна, у віцебскіх замовах амаль не сустрэнеш святых Юрыя, Міколу, Міхайлу, як на Палессі, вельмі спарадычна тут фіксаваныя Пётра, Анцыпій, Фабіян, Ціхан Задонскі.

М. Зав'ялава, параўноўваючы беларускія і літоўскія замовы, адзначае, што «адрознай рысай беларускіх замоў з'яўляецца выразнае проціпастаўленне свету чалавека (таго, хто замаўляе) астатняму свету, які ёсць антыподам свайго, яго люстраным адбіткам. Менавіта ў гэтым свеце разгортваецца асноўнае дзеянне замовы, там жывуць хваробы, там адбываецца барацьба двух пачаткаў ці заключаецца мірная дамова. Пераважная большасць беларускіх замоў пачынаецца з тэмы шляху ў гэты свет з паступовым звужэннем фокуса, набліжэннем да цэнтра, сутнасці» [5, с. 195].

Аднак замовы Віцебшчыны дэманструюць некалькі іншую карціну. Шлях самога знахара/хворага на той свет фіксаваны ў адзінкавых прыкладах. І хаця свет хваробы акрэслены досыць празрыста і выяўна, мяжы між светамі практычна не існуе. Хвароба – і нават у межах аднаго тэксту – адпраўляецца як на той свет, што за морам, так і на той, што ўнутры самога чалавека (гл. замовы ад залатніка). Наогул, падрабязная антрапамарфізацыя хваробы яшчэ раз сведчыць не проста пра дыялогавы характар дачыненняў між светамі, але і пра арганічнасць іх стасункаў, адсутнасць рэзкай мяжы.

І хаця «дапамога магутных сілаў выступае адной з асноўных прынцыповых асаблівасцяў беларускіх замоў» [5, с. 195], самы колькасна прадстаўнічы блок замоў Падзвіння прадстаўляе якраз наўпроставую камунікацыю чалавека з хваробай. Знахар або сам хворы звяртаецца да немачы з просьбамі ці патрабаваннямі рознай мадальнасці, імкнецца да выгоднай для сябе «здзелкі».

І некалькі заўваг адносна рэгіянальнай характарыстыкі адной з самых старажытных і паказальных асноўных тэматычных груп замоў ад змяі. У блоку замоў ад змяі ўсход Віцебшчыны (Арш., Лёзн., Шум.) вылучае пагрозы наслаць на гадаў нябесных воінаў з мячамі і агнём. Моцнае тут перакананне ў моцы самога знахара, які можа наслаць тры хмары (Віц., Гарад.) ці перамагчы змяю адным позіркам або засекчы сам (Беш., Дубр., Пол., Рас., Тал.). Варта агаварыцца, што такое падкрэсленне ўласнай магічнай моцы ў віцебскіх замовах і вылучае найперш блок «ад змяі» – адзін з самых старажытных. Архаічны матыў змяі на руне ў цэнтры свету зафіксаваны ў Віц., Гарад., Леп., Уш., Шум., глядзі – «На моры на Кіяні, на быстрым буяні стаіць ліпавы куст, пад тым кустом ляжыць бел камень, у белым камні чорна руна, у чорнай руні змяя Шкурлупея, сястра Палагея, цётушка Аўхім'я. А ты, змяя Шкурлупея, сястра Палагея, цётушка Аўхім'я, змірай сваіх змей, а то буду прасіць Міхайла-арханела – ён цябе громам заб'еиць, маланнёю спаліць, буйным ветрам по-пел разнясець. Унімі сваіх змей, сіпучых, лятучых, паўзучых, земляных, вадзяных, навозных, дзярновых, крышачных, бярновых, падкалодных, карчавых, падмежных, запечных, качарэжных. Госпадзі, памілуй, баславі, Госпадзі» [1, с. 113].

Віцебшчына як бы дзеліцца напалам у самім характары пагрозы змяі. Калі ўсходняя частка вылучае матывы «вогненнай» пагрозы – засячы яе, спаліць, прычым з дапамогаю самога Госпада Бога і Духа Святога ды святога нябеснага воінства, то на захадзе (Глыб., Шарк., Мёр.) змяю пакарае сама прырода, якая не прыме да сябе. «Гадзіна вадзяная, земляная, сляпні і вужы, змеі і вужакі, ярыца, пераярыца. Аддайце і вазьміце сваю жаласць і ярасць. Калі не аддасцё сваю жаласць і ярасць, то не будзе вам збудзішча ні пад кустом, ні пад лістом, ні пад карэннем. Сонца і яркі месяц не будзець вам свяціць і не будзе прынімаць вас сыра маць зямля»[1]. На поўначы (Рас.) змяю знахар пагражае ў зямлю адправіць. Цэнтр (Докш., Леп., Уш., Шум.) дапускае абменныя адносіны са змеямі. З персанажаў-памочнікаў ніжэйшага рангу вылучаюцца тры сястрыцы (Леп., Уш.):

На роўнай дарожцы ішло тры сястрыцы.
Адна ў золаце, другая ў серабрэ, трэццяя ў аксаміце.
І шыпуху-грымуху із-пад мяжы выгнялі і жыгала замаўлялі.
І я замаўляю.
Ва векі вякоў. Амінь[2].

[1] Архіў Глыбоцкага Дома культуры: зап. у в. Празарокі ад Хоміча Часлава Іосіфавіча, 1924 г. нар.
[2] Фальклорны архіў Віцебскага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта: зап. Л. Мазго ў в. Звязда Лепельскага р-на ад Янкоўскай Антаніны Пятроўны, 1924 г. нар.

У цэлым заканамерная і відавочная значная колькасць падзвінска-агульнабеларускіх адпаведнікаў. Найперш гэта тычыцца міжфункцыянальных матываў (г. зн. тых, якія скарыстоўваюцца пры лекаванні некалькіх хваробаў), тады як спецыфічных матываў адносна няшмат. Міжфункцыянальнасць такіх матываў яўна карэлюе з іх міждыялектнасцю і ўказвае на прыналежнасць да замоўнага універсуму ў цэлым. Асаблівым багаццем, разнастайнасцю матываў і паэтычнай распрацоўкай вылучаюцца замовы ад дзіцячых хваробаў, сурокаў, пярэпалаху, залатніка, звіху. Параўнальна няшмат замоў ад вогніка, валасня, адзінкавыя замовы ад каўтуна ці падучай, хаця амаль у кожнай вёсцы памятаюць пра рытуальна-магічнае лекаванне гэтых хвароб.

Як колькасныя паказнікі, так і характарыстыка асноўных матываў дазваляюць вылучыць наступныя зоны: па большасці крытэрыяў Віцебшчына дзеліцца на ўсход і захад, прычым колькасная і сюжэтна разнастайная характыстыка павялічваецца паступова з заходняй мяжы на ўсход, якасна новы зрух назіраецца перад Полацкім, Ушацкім раёнамі, але ўлучае і Докшыцкі р-н. Эпіцэнтрам бачыцца Лепельшчына з прылеглымі Докшыцкім, Ушацкім, Чашніцкім раёнамі. Усходняя падзвінская зона выразна адасабляецца ад Талочынскага, Аршанскага, Дубровенскага раёнаў, якія складаюць гісторыка-этнаграфічную зону Падняпроўя. Поўнач Віцебшчыны прадстаўлены адносна невялікай колькасцю запісаў, якія, аднак, выяўляюць пэўную розніасць з Мёрскімі ці Полацкімі. У заходніх раёнах запісана няшмат замоў, да чаго спрычыніліся закрытасць традыцыі, уплыў касцёлу, які ставіцца да замаўлення негатыўна, літоўскае этнічнае памежжа са сваёй практыкай лекавання замовамі.

Застаецца адкрытым пытанне, чаму ў некаторых традыцыях той ці іншы універсальны сюжэт не зафіксаваны ці прадстаўлены адзінкавымі запісамі. Хутчэй за ўсё тут сказваецца непаўната сабранага матэрыялу і, верагодна, пры далейшым зборы многія лакуны будуць запоўненыя.

Праца выканана ў межах галіновай праграмы «Культура».

ЛІТАРАТУРА

1. Замовы / уклад., сістэм. тэкст., уступ. арт. і камент. Г.А. Барташэвіч; рэдкал.: А.С. Фядосік (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Навука і тэхніка, 1992. – 597 с.
2. Полацкі этнаграфічны зборнік: у 2 ч. / склад. У.А. Лобач, У.С. Філіпенка. – Наваполацк: ПДУ, 2006. – Вып. 1. Народная медыцына беларусаў Падзвіння.
3. Шлюбскі, І. Матар'ялы да вывучэння фальклёру і мовы Віцебшчыны / І. Шлюбскі, Ал. Шлюбскі. – Мінск: Друк. Інбелкульту. – 190 с.
4. Агапкина, Т.А. Сюжетный состав восточнославянских заговоров (мотив мифологического центра) / Т.А. Агапкина // Заговорный текст. Генезис и структура. – М.: Индрик, 2005. – С. 247 – 291.
5. Завьялова, М.В. Балто-славянский заговорный текст: лингвист. анализ и модель мира / М.В. Завьялова; Ин-т славяноведения РАН. – М.: Наука, 2006. – 563 с.

## ПАГАНСКІЯ КАПІШЧЫ І ДАХРЫСЦІЯНСКІЯ КУЛЬТАВЫЯ КОМПЛЕКСЫ ПАСТАЎШЧЫНЫ

*краязнаўца А. ГАРБУЛЬ*
*(Лынтупы, Пастаўскі раён)*

*На падставе палявых краязнаўчых даследаванняў і аналізу навуковых крыніц зроблена спроба абагульніць, сістэматызаваць інфармацыю па аб'ектах сакральнай геаграфіі Пастаўскага рэгіёну і ахарактарызаваць іх міфалагічны статус і рытуальныя функцыі як у часы старажытнасці, так і на сучасным этапе.*

Пошукам дахрысціянскіх культавых помнікаў аўтар займаецца ўжо больш 15 гадоў. За гэты час зроблена больш 200 экспедыцый, падчас якіх сабрана шмат фальклорнага і этнаграфічнага матэрыялу, выяўлена каля 100 аб'ектаў старажытных культаў (культавыя камяні, дрэвы, крыніцы, балоты, горы і інш.). І гэта ўсё на невялічкай тэрыторыі заходняй часткі Пастаўскага раёна, у ваколіцах мястэчка Лынтупы, плошчай каля 1000 кв. км.

Большасць гэтых аб'ектаў вядомая шырокаму колу даследчыкаў. Так, напрыклад, Святы (Дзюравы) камень ля в. Каптаруны, на думку даследчыцы Л.У. Дучыц, з'яўляецца адным з самых вядомых культавых камянёў Беларусі ў навуковых колах Еўропы.

Вывучэннем знойдзеных намі культавых аб'ектаў з непасрэдным выездам на месца займаліся вядомыя навукоўцы: Эдвард Зайкоўскі, Людміла Дучыц, Уладзімір Васілевіч, Валеры Вінакураў (Беларусь), Вікантас і Дайва Вайткевічус (Літва), Дзяніс Самкоў (Расія), знаёміліся і іншыя навукоўцы падчас